ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.10.2025 № 447

Праграма ўступных іспытаў
па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі
ў кантэксце сусветнай гісторыі»
для атрымання агульнай вышэйшай
і спецыяльнай вышэйшай адукацыі,
2026 год

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» прызначана для асоб, якія паступаюць ва ўстановы вышэйшай адукацыі для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі.

Праграма складзена ў адпаведнасці са зместам вучэбных праграм па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» для X і XI класаў, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Паказчыкамі ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў з’яўляюцца ўзровень засваення тэарэтычнага, факталагічнага вучэбнага матэрыялу і адпаведных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ

Абітурыент павінен в е д а ц ь:

асноўны тэарэтычны і факталагічны матэрыял па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі», вывучаны ў X–XI класах;

асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага развіцця Беларусі і іншых рэгіёнаў свету са старажытных часоў да нашых дзён.

Абітурыент павінен у м е ц ь:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць гістарычных падзей, з’яў і працэсаў, іх працягласць;

сінхранізаваць з’явы і працэсы, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнах свету;

лакалізаваць на картасхеме вывучаныя гістарычныя падзеі, з’явы і працэсы;

характарызаваць асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага развіцця Беларусі і іншых рэгіёнаў свету з апорай на розныя крыніцы інфармацыі;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж сацыяльна-эканамічнымі, грамадска-палітычнымі, культурнымі з’явамі і працэсамі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету;

сістэматызаваць і абагульняць вывучаныя гістарычныя факты;

параўноўваць гістарычныя з’явы і працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў іншых рэгіёнах свету;

суадносіць адзін з адным розныя пункты гледжання адносна адных і тых жа гістарычных фактаў, з’яў і працэсаў;

канкрэтызаваць тэарэтычныя вывады і змест гістарычных паняццяў гістарычнымі фактамі;

праводзіць аналіз зместу розных гістарычных крыніц;

перакладаць вербальную інфармацыю ў наглядна-вобразную і наадварот;

устанаўліваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе вырашэння вучэбных задач.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 1. СТАНАЎЛЕННЕ НАЙСТАРАЖЫТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ. БЕЛАРУСЬ У ДАДЗЯРЖАЎНЫ ПЕРЫЯД

*Эвалюцыя грамадства і эканомікі ў старажытнасці.* Рассяленне людзей на кантынентах Зямлі. З’яўленне людзей на тэрыторыі Беларусі. Калектывы старажытных людзей: ад радавой абшчыны да суседскай. Перыядызацыя гісторыі першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі. Удасканаленне прылад працы і тэхналогій. Неалітычная рэвалюцыя. Наступствы пераходу да вытворчай гаспадаркі. Адкрыццё металургіі і яе значэнне. Прычыны і значэнне міграцый насельніцтва. Індаеўрапейская экспансія на тэрыторыі Беларусі.

*Найстаражытныя вераванні. Мастацтва.* Асаблівасці светапогляду старажытных людзей. Першабытныя вераванні. Мастацтва каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў.

*Асаблівасці старажытных цывілізацый.* Узнікненне першых лакальных цывілізацый у свеце. Асаблівасці арганізацыі ўлады, грамадства і эканомікі Старажытнага Усходу, Старажытнай Грэцыі, Старажытнага Рыму. Беларускія землі ў эпоху антычнасці. Асноўныя культурныя дасягненні старажытных цывілізацый. Узнікненне хрысціянства.

## 2. СВЕТ У ЭПОХУ РАННЯГА І ВЫСОКАГА СЯРЭДНЯВЕЧЧА. ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*Асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, рэлігійнага і культурнага развіцця цывілізацый Еўропы і Азіі ў Раннім і Высокім сярэднявеччы.* Дзяржавы Ранняга і Высокага сярэднявечча на Захадзе: палітычнае і эканамічнае развіццё. Еўрапейскае грамадства ў Раннім і Высокім сярэднявеччы. Палітычнае і сацыяльнае развіццё краін Азіі ў перыяд Ранняга і Высокага сярэднявечча. Рэлігіі ў жыцці сярэдневечных грамадстваў. Развіццё культуры ў Раннім і Высокім сярэднявеччы.

*Вялікая славянская міграцыя і Беларусь. Старажытная Русь – дзяржава ўсходніх славян.* Праблема паходжання славян. Рассяленне славян. Шляхі міграцыі славян ва Ўсходняй Еўропе. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі. Славянскія саюзы плямёнаў.

Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы. Княжацкая ўлада. Беларускія землі ў Старажытнарускай дзяржаве. Палітыка першых усходнеславянскіх князёў. Росквіт Старажытнай Русі. Палітычная раздробненасць Старажытнай Русі, яе прычыны і наступствы.

*Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі.* Утварэнне Полацкага княства. Дзейнасць полацкіх князёў па ўмацаванні дзяржавы. Тураўскае княства. Асаблівасці палітычнага развіцця Полацкага і Тураўскага княстваў у XI ст. Раздробненасць Полацкага і Тураўскага княстваў. Асаблівасці становішча Гарадзенскага княства. Беларускія землі ў складзе Смаленскай, Чарнігаўскай, Кіеўскай і Валынскай зямель.

*Барацьба са знешнімі заваёўнікамі.* Барацьба Старажытнай Русі з качавымі плямёнамі. Полацкія князі ў войнах з качэўнікамі. Мангольскае нашэсце на Ўсходнюю Еўропу і яго наступствы. Ардынскае ярмо. Нямецкая экспансія ва Усходняй Прыбалтыцы. Барацьба з крыжакамі.

*Грамадства і эканоміка беларускіх зямель у IX–XIII стст.* Структура грамадства. Роля абшчыны. Асаблівасці развіцця гаспадаркі. Развіццё рамёстваў. Шляхі ўзнікнення і функцыі старажытных гарадоў Беларусі. Характар і змест гандлю.

*Распаўсюджванне хрысціянства на тэрыторыі Беларусі.* Асаблівасці язычніцкага светапогляду. Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства на тэрыторыі Русі. Фарміраванне царкоўнай арганізацыі. Полацкая і Тураўская епархіі. Суіснаванне язычніцтва і хрысціянства. Рэлігійна-асветніцкая дзейнасць у XII ст. Еўфрасіння Полацкая. Кірыл Тураўскі. Значэнне прыняцця хрысціянства.

*Культура Беларусі ў IX–XIII стст.* Пісьменнасць. Рукапісныя кнігі. Вусная народная творчасць. Характэрныя рысы архітэктуры. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

## 3. РАЗВІЦЦЁ СУСВЕТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ У ПОЗНІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА, РУСКАГА І ЖАМОЙЦКАГА

*Асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўнага развіцця цывілізацый у Познім сярэднявеччы*. Стварэнне цэнтралізаваных дзяржаў у Заходняй Еўропе. Фарміраванне саслоўна-прадстаўнічых органаў. Уплыў таварна-грашовых адносін на сацыяльную структуру еўрапейскага феадальнага грамадства. Эканамічныя змены ў сярэднявечным горадзе. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці. Візантыя ў перыяд Позняга сярэднявечча. Асаблівасці ўтварэння расійскай дзяржаўнасці. Усходнія дэспатыі. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Усходу. Роля царквы ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці еўрапейскіх дзяржаў. Культура ў другой палове XIII–XIV ст.

*Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), дзейнасць вялікіх князёў па ўмацаванні дзяржавы*. Палітычная сітуацыя ва Усходняй Еўропе ў сярэдзіне XIII ст. Прычыны ўтварэння новай дзяржавы. Шляхі ўваходжання ўсходнеславянскіх земляў у новую дзяржаву. Дзейнасць вялікіх князёў па фарміраванні тэрыторыі дзяржавы. Значэнне старажытнарускай спадчыны ў арганізацыі ВКЛ.

*Дзяржаўны лад і сістэма кіравання ВКЛ.* Унутрыпалітычная барацьба ў ВКЛ у канцы XIV ст. Узмацненне вялікакняскай улады ў час праўлення Вітаўта. Барацьба за ўладу пасля смерці Вітаўта. Змены ў дзяржаўным кіраванні да канца XV ст., пераход да саслоўна-прадстаўнічай манархіі.

*Знешняя палітыка ВКЛ*. Крэўская унія і яе наступствы. Барацьба з крыжакамі. Грунвальдская бітва і яе значэнне. Прычыны сутыкнення інтарэсаў ВКЛ і Маскоўскага вялікага княства.

*Развіццё феадальных адносін у ВКЛ*. Пазямельныя адносіны ў ВКЛ. Саслоўі феадальнага грамадства: правы, абавязкі і прывілеі. Шляхі фарміравання залежнага сялянства. Пачатак запрыгоньвання сялян на тэрыторыі Беларусі.

*Развіццё гарадоў, рамёстваў і гандлю на тэрыторыі Беларусі*. Развіццё беларускіх гарадоў і мястэчак. Распаўсюджванне магдэбургскага права. Гарады – цэнтры рамяства і гандлю.

*Рэлігійнае жыццё на тэрыторыі Беларусі*. Праваслаўная царква ў ВКЛ. Змяненне рэлігійнай палітыкі ў ВКЛ пасля заключэння Крэўскай уніі. Распаўсюджванне каталіцызму. Спробы заключэння царкоўнай уніі.

*Культура Беларусі ў другой палове XIII–XV стст.* Культавае і абарончае дойлідства. Літаратура. Забавы і святы.

*Фарміраванне беларускай народнасці*. Умовы фарміравання беларускай народнасці. Складванне этнічнай тэрыторыі. Фарміраванне

этнічнай самасвядомасці. Саманазвы беларусаў. Старабеларуская мова. Штодзённае жыццё і побыт насельніцтва Беларусі.

## 4. БЕЛАРУСЬ І ЦЫВІЛІЗАЦЫІ СВЕТУ Ў ПЕРЫЯД РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ

*Асноўныя тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўнага развіцця цывілізацый у XVI–XVIII стст.* Каланіяльная экспансія еўрапейскіх дзяржаў. Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця цывілізацый свету ў XVI–XVIII стст. Сутыкненне цывілізацый Захаду і Усходу. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця цывілізацый свету. Гуманізм і Адраджэнне. Рэфармацыя і Контррэфармацыя. Эпоха Асветніцтва.

*Палітычнае развіццё Беларусі ў XVI–XVIII стст.* Дзяржаўны лад ВКЛ у першай палове XVI ст. Статуты ВКЛ 1529 г., 1566 г., 1588 г. Люблінская унія. Утварэнне Рэчы Паспалітай. Барацьба ВКЛ за самастойнасць. Прычыны ўнутрыпалітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай. Спробы рэформ. Падзелы Рэчы Паспалітай.

*Беларусь у еўрапейскіх войнах у XVI–XVIII стст.* Лівонская вайна і яе наступствы для Беларусі. Ваенныя канфлікты Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай у XVII ст. Казацка-сялянская вайна на тэрыторыі Беларусі. Паўночная вайна і яе наступствы для Беларусі.

*Эканамічнае становішча Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст.* Перадумовы станаўлення фальваpачна-паншчыннай гаспадаркі на беларускіх землях. «Валочная памера», яе наступствы. Гарады, заняткі насельніцтва. Развіццё ўнутранага і знешняга гандлю.

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVII–XVIII стст.* Эканамічны заняпад і дэмаграфічны спад. Шляхі пераадолення крызісу. Сацыяльныя супярэчнасці. Зараджэнне капіталістычных адносін. З'яўленне мануфактур. Магнацкае прадпрымальніцтва. Спробы эканамічнага рэфарміравання ў другой палове XVIII ст.

*Рэфармацыйны рух і Контррэфармацыя ў ВКЛ.* Канфесійная сітуацыя ў ВКЛ у пачатку XVI ст. Асаблівасці і напрамкі Рэфармацыі ў ВКЛ. Контррэфармацыя ў ВКЛ.

*Канфесійная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVI–XVIII стст.* Становішча Праваслаўнай царквы ў другой палове XVI ст. Заключэнне Брэсцкай царкоўнай уніі. Станаўленне уніяцкай царквы на тэрыторыі Беларусі. Канфесіі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII ст.

*Гуманізм і Адраджэнне на тэрыторыі Беларусі.* Асаблівасці эпохі Адраджэння на тэрыторыі Беларусі. Францыск Скарына – беларускі

першадрукар, асветнік, філосаф і гуманіст. Паслядоўнікі Францыска Скарыны. Дасягненні беларускай культуры ў эпоху Адраджэння.

*Развіццё адукацыі і навуковых ведаў у Беларусі.* Сістэма адукацыі ў XVI–XVII стст. Віленская езуіцкая акадэмія. Грамадска-палітычная думка ў XVI–XVII стст. Сімяон Полацкі. Эпоха Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі. Рэформы Эдукацыйнай камісіі. Развіццё навуковых ведаў у XVII–XVIII стст.

*Культура Беларусі ў другой палове XVI–XVIII стст.* «Сарматызм» у беларускай культуры канца XVI–XVIII стст. Кніжная справа і літаратура. Архітэктура. Выяўленчае мастацтва. Музыка і прыгонны тэатр. Народная культура. Паланізацыя насельніцтва Беларусі.

## 5. БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*Аснаўныя тэндэнцыі гістарычнага развіцця краін свету ў XIX – пачатку XX ст.* XIX стагоддзе ў гісторыі свету і Беларусі. Прамысловая рэвалюцыя і яе наступствы. Рэвалюцыі і нацыянальныя рухі ў свеце. Узнікненне новых нацыянальных дзяржаў у Еўропе і Лацінскай Амерыцы. Асаблівасці развіцця краін Захаду і Усходу ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

*Расійская імперыя ў XIX – пачатку XX ст.* Рэформы дзяржаўнага кіравання. Эвалюцыя дзяржаўнага ладу. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Грамадскія рухі. Руская Праваслаўная царква і яе ўплыў.

*Беларусь у складзе Расійскай імперыі ў пачатку XIX ст.* Дзяржаўна-прававы статус беларускіх губерняў. Палітыка расійскіх уладаў на тэрыторыі Беларусі. Сацыяльная і этна-канфесійная структура, узровень адукацыі насельніцтва беларускіх губерняў.

*Развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.* Сельская гаспадарка ў першай палове XIX ст. Адмена прыгоннага права. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Асаблівасці правядзення аграрных пераўтварэнняў на тэрыторыі Беларусі, вынікі і наступствы.

*Беларусь на шляху да індустрыяльнага грамадства. Сацыяльныя наступствы прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі.* Асаблівасці пераходу ад ручной вытворчасці да машыннай ў прамысловасці. Манапалістычны капіталізм у Беларусі. Развіццё транспарту і гандлю. Фарміраванне нацыянальнага рынку. Урбанізацыя. Змяненне сацыяльнай структуры беларускага грамадства. Становішча сялян і працоўных. Працоўныя міграцыі. Перасяленчы рух.

*Грамадска-палітычныя рухі ў Беларусі ў XIX ст. Грамадска-палітычная барацьба ў пачатку XX ст.* Праекты грамадска-палітычнага і культурнага развіцця беларускіх земляў. Нацыянальныя рухі у Беларусі: прычыны, мэты, характар, плыні. Польскае пытанне і шляхецкія паўстанні. Уплыў расійскага грамадска-палітычнага руху. Узнікненне палітычных

партый. Рэвалюцыя 1905– 1907 гг. у Расіі і на тэрыторыі Беларусі. Беларускі нацыянальна-культурны рух.

*Ад беларускай народнасці да беларускай нацыі. Беларускае грамадства ў пачатку XX ст.* Паняцце «нацыя». Умовы фарміравання беларускай нацыі. Развіццё навуковых ведаў аб Беларусі і беларускім народзе. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі. Дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі. Сацыяльны, нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва. Адукацыйны ўзровень насельніцтва. Фарміраванне інтэлектуальнай эліты.

*Культура Беларусі XIX – пачатку XX ст.* Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці навукі, тэхнікі, культуры ў XIX ст. Польскі і расійскі ўплыў на развіццё культуры Беларусі ў XIX ст. Станаўленне новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Адукацыя і навука. Развіццё мастацтва.

*Першая сусветная вайна як межавы перыяд сусветнай гісторыі. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны*. Прычыны, характар вайны. Асноўныя ўдзельнікі і іх мэты. Тэатры ваенных дзеянняў. Новае аблічча вайны. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Становішча насельніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Рабочыя і сялянскія пратэсты. Беларускі нацыянальны рух. Брэсцкі мірны дагавор. Геапалітычныя наступствы Першай сусветнай вайны. Наступствы Першай сусветнай вайны для Беларусі.

## 6. БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У 1917–1945 гг.

*Асноўныя тэндэнцыі гістарычнага развіцця краін свету ў 1917–1945 гг.* Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін: сутнасць і супярэчнасці. Змены на палітычнай карце Еўропы пасля Першай сусветнай вайны. Геапалітычнае значэнне стварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (далей – СССР). Краіны Захаду ў міжваенны перыяд. Пасляваенны крызіс. Эканамічны ўздым у сярэдзіне – другой палове 1920-х гг. Нацыяналізм і мілітарызм у Еўропе і свеце. Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў міжваенны перыяд. Сусветны эканамічны крызіс і яго наступствы. Агрэсіўная палітыка Германіі, Італіі і Японіі ў 1930-я гг. Палітыка прымірэння агрэсара. Мюнхенскі дагавор і яго роля ў развязванні Другой сусветнай вайны. Дзейнасць СССР у кантэксце геапалітычнай сітуацыі ў свеце.

*Беларусь у Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях*. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі ў Расіі. Лютаўская рэвалюцыя ў Беларусі. Уздым беларускага нацыянальнага руху. Кастрычніцкая рэвалюцыя на тэрыторыі Беларусі. Усебеларускі з’езд.

*Савецкая дзяржава ў 1917–1939 гг.* Грамадзянская вайна: асноўныя этапы, удзельнікі і іх мэты, наступствы. Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні савецкай улады. Савецкая мадэль мадэрнізацыі. Утварэнне

СССР. Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы. Вынікі палітычнай і эканамічнай трансфармацыі.

*Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі.* Гістарычныя ўмовы стварэння беларускай дзяржавы. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (далей – ССРБ). Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг. і Рыжскі мірны дагавор. Удзел ССРБ ва ўтварэнні СССР. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (далей – БССР).

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у 1920–1930-я гг.* Новая эканамічная палітыка і савецкая мадэрнізацыя ў БССР. Рэалізацыя нацыянальнай палітыкі. Вынікі сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

*Заходняя Беларусь у 1921–1939 гг.* Тэрыторыя, насельніцтва. Аграрна-сыравінны характар эканомікі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Нацыянальная і канфесійная палітыка польскіх улад. Паланізацыя насельніцтва. Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і рабочы рух. Стан беларускай культуры.

*Развіццё культуры Савецкай Беларусі ў міжваенны перыяд.* Палітыка Савецкай дзяржавы ў галіне культуры. Адукацыя ў Савецкай Беларусі. Станаўленне беларускай навукі. Дасягненні ў развіцці беларускай мовы і літаратуры, драматургіі, тэатра і кіно. Тэндэнцыі ў развіцці беларускага мастацтва.

*Другая сусветная вайна.* Асноўныя ўдзельнікі і іх геапалітычныя мэты. Перыядызацыя Другой сусветнай вайны. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Асноўныя тэатры ваенных дзеянняў. Рух Супраціўлення. Дзейнасць антыгітлераўскай кааліцыі. Наступствы Другой сусветнай вайны.

*Вялікая Айчынная вайна.* Планы нацысцкай Германіі адносна СССР. Характар вайны. Арганізацыя кіравання Савецкай дзяржавай у ваенных умовах. Добраахвотная самамабілізацыя грамадства. Стаўленне Савецкай дзяржавы да Рускай праваслаўнай царквы. Асноўныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Палітыка германскіх уладаў на акупіраваных тэрыторыях. Партызанскі і падпольны рух. Цана і крыніцы Перамогі. Роля Савецкага Саюза ў Вялікай Перамозе.

*Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне.* Абарончыя баі на тэрыторыі БССР і іх значэнне. Насельніцтва Беларусі ва ўмовах акупацыі. Генацыд беларускага народа. Эканамічная эксплуатацыя акупіраваных тэрыторый. Калабарацыянізм: прычыны і формы. Масавая барацьба супраць фашысцкіх захопнікаў. Партызанскі і падпольны рух на тэрыторыі Беларусі. Захаванне беларускай дзяржаўнасці ў гады вайны. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аперацыя «Баграціён». Уклад беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй. Наступствы вайны для Беларусі.

## 7. БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 40-Х ГАДОЎ – ПАЧАТКУ 1990-Х ГАДОЎ ХХ СТ.

*Свет у другой палове ХХ – першай чвэрці ХХІ ст.* Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін. Фарміраванне двухполюснага свету. Крушэнне каланіяльнай сістэмы. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і фарміраванне постіндустрыяльнага грамадства. Палітычная і эканамічная сістэмы краін Захаду, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

*СССР у 1945–1991 гг.* Палітычная сістэма СССР. Узаемаадносіны ўлады і грамадства: асноўныя этапы развіцця. Маральныя нормы і маральныя каштоўнасці савецкага чалавека. Дасягненні і праблемы савецкай сацыяльнай палітыкі і эканомікі. Асноўныя тэндэнцыі развіцця савецкай культуры.

*Грамадска-палітычнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – 1991 гг.* Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны. Умацаванне беларускай дзяржаўнасці. Дзейнасць Саветаў і грамадскіх арганізацый. Стаўленне да царквы. Рашэнне нацыянальнага пытання.

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – 1991 гг* Подзвіг беларускага народа па аднаўленні эканомікі. Асноўныя этапы развіцця і структура эканомікі БССР. Сацыяльнае развіццё. БССР у народна-гаспадарчым комплексе Савецкага Саюза.

*Навука, культура і адукацыя ў БССР.* Развіццё культуры і мастацтва ў другой палове 1940-х – 1991 гг. Дасягненні ў галіне навукі. Развіццё адукацыі.

## 8. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У КАНЦЫ ХХ – ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ ХХІ СТ.

*Свет у канцы ХХ – першай чвэрці ХХІ ст.* Геапалітычныя наступствы распаду СССР. Глабалізацыя. Постіндустрыяльнае грамадства. Ад аднапалярнасці да шматпалярнага свету. «Каляровыя рэвалюцыі». Сучасная палітычная і эканамічная сістэмы краін Захаду. Крызіс «дзяржавы дабрабыту». Сучасныя праблемы еўраінтэграцыі. Праблемы незалежнага развіцця і мадэрнізацыі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Неакаланіялізм.

*Расійская Федэрацыя.* Распад СССР. Дзяржаўна-палітычнае развіццё Расійскай Федэрацыі. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў Расійскай Федэрацыі. Расійская Федэрацыя на міжнароднай арэне.

*Рэспубліка Беларусь у першай палове 1990-х гг.* Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту. Грамадска-палітычны і сацыяльна-эканамічны крызіс. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Структура і функцыі органаў улады. Прэзідэнцкія выбары 1994 г.

*Прэзідэнцкая рэспубліка – гістарычны выбар беларускага народа.* Рэферэндум 1995 г. Гістарычнае значэнне рэферэндуму 1996 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь: месца і роля ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Паўнамоцтвы, функцыі і дзейнасць. Рэферэндумы 2004, 2022 гг. Усебеларускі народны сход.

*Эканамічнае развіццё сучаснай Беларусі.* Беларуская мадэль эканамічнага развіцця. Стратэгічныя напрамкі развіцця эканомікі. Найбольш важныя эканамічныя дасягненні Рэспублікі Беларусь у 1994–2025 гг. Выклікі і пагрозы эканамічнай бяспекі.

*Сацыяльная палітыка ў сучаснай Беларусі.* Рэспубліка Беларусь – сацыяльна арыентаваная дзяржава. Палітыка дзяржавы ў галіне адукацыі і аховы здароўя. Дзяржаўная падтрымка інстытута сям'і. Рынак працы. Асновы маладзёжнай палітыкі.

*Сучаснае беларускае грамадства.* Міжнацыянальныя адносіны. Канфесійная палітыка дзяржавы. Каштоўнасныя арыентацыі. Гістарычная палітыка Рэспублікі Беларусь. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі ў сучаснай Беларусі.

*Рэспубліка Беларусь у свеце.* Геапалітычнае становішча. Шматвектарны характар знешняй палітыкі. Удзел у інтэграцыйных працэсах (Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Еўразійскі эканамічны саюз, Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, БРІКС). Дзейнасць у міжнародных арганізацыях.

*Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі.* Асноўныя этапы станаўлення міждзяржаўных адносін Беларусі і Расіі пасля распаду СССР. Фарміраванне адзінай эканамічнай, сацыяльнай і тэхналагічнай прасторы. Узаемадзеянне ў сферы знешняй палітыкі і бяспекі. Рэгіянальнае супрацоўніцтва.

*Культура сучаснай Беларусі.* Прыярытэтныя напрамкі развіцця навукі. Інавацыйнае і навукова-тэхналагічнае развіццё. Дзяржаўная палітыка ў галіне культуры. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. Спартыўныя дасягненні.

# СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа» ад 5 студзеня 2022 г. № 146-З // Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. Мінск, 2022–2025. – URL: https://pravo.by/document/?guid=3961&p0=H12200146 (дата звароту: 15.08.2025).

2. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі (з найстаражытных часоў да канца XVIII ст.) : вучэб. дапаможнік для 10 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню : ў 2 ч. / пад рэд. А. Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – Ч. 1. – 223 с. – Ч. 2. – 302 с.

3. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі (XIX – першая чвэрць XXI ст.): вучэб. дапаможнік для 11 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання, з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню : ў 2 ч. / пад рэд. А. Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – Ч. 1. – 312 с. – Ч. 2. – 320 с.